


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 6 (223) 26 мая 1995 года, пятніца





## НА ВУЧОНАЙ РАДЗЕ

28 красавіка адбылося чарговае пасяджэнне Вучонай Рады універсітэта.

З інфармацыяй аб працы па павышэнню якасці выкладання філалагічных дысцыплін на факультэтах філалогіі і замежных моваў выступіла загадчык навучальна-метадычнага аддзела Т.А.Бадзюкова. Адзначыўшы, што ў навучальным працэсе на факультэтах філалогіі і замежных моваў склаліся асноўныя формы і метады падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне рускай, беларускай і польскай філалогіі, ідзе станаўленне падрыхтоўкі спецыялістаў па класічнай філалогіі і рамана-германскіх мовах, а таксама планамерную працу саветаў факультэтаў і кафедраў над павышэннем якасці выкладання філалагічных дысцыплін, Вучоная Рада лічыць неабходным узмацніць працу па навучальна-метадычнаму і арганізацыйнаму забеспячэнню падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў.

Адбылося выбранне па конкурсу на замяшчэнне вакантных пасадаў. На пасаду прафесара кафедры алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі выбрана Л.У.Кірылюк, прафесар, кандыдат педагагічных навук. На пасаду загадчыка кафедры спартыўных гульняў выбраны В.У.Грыгарэвіч, дацэнт, кандыдат гістарычных навук.

*Победным маем в сорок пятом*
*Укрощена была война.*
*К ногам уставшего солдата,*
*Оскалясь, рухнула она.*
*Из хищной пасти вырвал жало*
*Советский воин-исполин.*
*Война поверженной лежала,*
*Горел разрушенный Берлин.*
*У Шпрее остывали танки,*
*Коней поить вели к реке.*
*Солдат пехоты, сняв портянки,*
*Развесил их на ветерке.*
*Над темным куполом рейхстага*
*Сквозь дым пожарищ всем видны,*
*Победно пламенели флаги,*
*А мир оглох от тишины.*
*Но что-то в воздухе витало,*
*Во что-то вылиться должно:*
*Четыре года грохотало*
*И тихо сделалось - чудно!*
*И вдруг прошили трассы небо.*
*Комбат подумал: - Немцы прут!*
*Но тот огонь войною не был -*
*То в честь Победы был салют.*

**Георгий Пальчевский**





# «МЫ НЕ МАГЛІ НЕ ПЕРАМАГЧЫ...»

Анатоль Міронавіч Шышко - старшы лабарант кафедры фізвыхавання. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сілаў СССР, падпалкоўнік у адстаўцы.

Калі пачалася вайна, Анатоль Міронавіч праходзіў тэрміновую службу ў Казахстане. Пасля кароткай падрыхтоўкі ў складзе 115-й стралковай брыгады 4-га стралковага корпуса 16-й арміі пад камандаваннем Ракасоўскага прымаў удзел у баях пад Масквой...



Гэтую снежаньскую бітву з фашыстамі Анатоль Міронавіч памятае, быццам падзеі адбываліся ўчора. Так, быў цяжкі для маладых вайскоўцаў экзамен, але яны вытрымалі яго з гонарам.

- Жорсткія ішлі баі: выжылі тады нямногія, - расказвае Анатоль Міронавіч .- Але перамога пад Масквой была неабходна для нас, вайскоўцаў, для ўсяго савецкага народа. Мы паверылі ў свае сілы, набылі веру ў тое, што праўда пераможа, даказалі, што ёсць вялікая сіла, перад якой не выстаяць фашысты.

Потым ваяваў у зенітным батальёне, у артылерыйскім палку, праводзіў палітработу сярод байцоў. Былі баі на Мажайскім напрамку, удзел у Беларускай аперацыі, вызваленне Прыбалтыкі, Кёнігсберг...

Анатоль Міронавіч быў двойчы паранены, але пасля лячэння ў шпіталях зноў ішоў у бой, на перадавую.

Нямала ў ветэрана баявых узнагародаў, кожная з якіх - прызнанне смеласці, мужнасці, рашучасці ў барацьбе з ворагам.

- Мы не маглі не перамагчы. Абаранялі жа родную зямлю, маці, жонак, дзяцей, каханых... Біліся, не думаючы аб уласным жыцці.

А калі скончылася вайна, мірную працу савецкіх людзей трэба было ахоўваць. Вось і стала святая справа - абараняць Радзіму - асноўнай прафесіяй Анатоля Міронавіча, стала справай усяго жыцця. Служыў у Групе савецкіх войскаў у Германіі, потым - у ракетных войсках Узброеных Сілаў СССР. Трыццаць гадоў працуе ў нашым універсітэце, дакладна і старанна выконвае свае абавязкі.

50 гадоў, як скончылася вайна. Але памяць зноў і зноў вяртае Анатоля Міронавіча ў тыя доўгія дні вайны. І зноў побач баявыя сябры, якія засталіся на палях баёў..., зноў чутны свіст куль і выбухі снарадаў...

**Н. КРАСНІЦКАЯ**

# НЕ СТАРЭЮЦЬ ДУШОЮ ВЕТЭРАНЫ

Дацэнт кафедры алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі Іван Міхайлавіч Сцяпура - адзін з ветэранаў матэматычнага факультэта. Нялёгка пачыналася яго працоўнае жыццё. Заканчэнне васьмігадовай вясковай школы супала з пачаткам страшэннай вайны. Займаўся сельскай гаспадаркай, потым, у ліпені 1944 года, у 19-гадовым узросце ўступіў у Савецкую Армію.

У складзе 17-й асобнай штурмавой інжынерна-сапёрнай брыгады 1-га Беларускага фронту Іван Міхайлавіч удзельнічаў у ваенных аперацыях на тэрыторыі Заходняй Беларусі, Польшчы, Германіі. Асабліва цяжкія баі прыйшлося вытрымаць на Кюстрынскім плацдарме за Одэрам. 16 красавіка 1945 года, у першы дзень Берлінскай аперацыі, ён быў паранены.

Калі вайна скончылася, служыў у Германіі. У Берліне паступіў у вячэрнюю сярэднюю школу пры Палітупраўленні СВАТ, а пасля яе заканчэння ў 1948 годзе - на першы курс завочнага ад-



дзялення фізіка-матэматычнага факультэта Баранавіцкага настаўніцкага інстытута (потым перайшоў на яго стацыянар).

З дыпломам настаўніка І.М. Сцяпура чатыры гады працаваў выкладчыкам матэматыкі ў вясковай школе ў Брэсцкай вобласці. Тады ж ён паступіў на завочнае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Гродзенскага педінстытута, які скончыў з выдатнымі адзнакамі.

Са жніўня 1954 года Іван Міхайлавіч працуе ў нашым універсітэце. У 1971 годзе ён абараніў кандыдацкую дысертацыю ў Маскоўскім абласным педінстытуце. Заўсёды паказваў прыклад добрасумленных адносінаў да сваёй прафесійнай справы. Ён выконваў абавязкі загадчыка кафедры элементарнай матэматыкі, 9 гадоў працаваў намеснікам дэкана матэматычнага факультэта.

У розны час І. М. Сцяпура атрымаў высокія дзяржаўныя ўзнагароды - ордэн Айчыннай вайны першай ступені, медалі «За адвагу», « За доблесную працу» і дзесяць іншых. Ён мае нагрудны знак «Выдатнік народнай асветы», узнагароджаны пяццю Ганаровымі граматамі Міністэрства асветы, вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Кваліфікаванай працай, педагагічным талентам і высокімі асобнымі якасцямі Іван Міхайлавіч заваяваў аўтарытэт у калегаў і вучняў. У светлае свята 50-годдзя Перамогі жадаем яму добрага здароўя і далейшых творчых поспехаў на карысць матэматычнай адукацыі!

**Ю. ЗАЛАТУХІН,**
**загадчык кафедры**
**алгебры, геаметрыі і МВМ.**

*Сяргей Псеўданімбаў*

## ВЕТЭРАНАМ

Гэтыя хлопчыкі, адкуль яны
Тут,дзе зямля гарыць
пад ботамі?
І падаюць яны пад кулямі,
І гінуць за калючым дротам.

Хто вы, салдаты
безыменныя,
Чые надзеі не збыліся,
Што тут, пад зоркамі
фанернымі,
Пад курганамі засталіся?

Хто вы, героі невядомыя,
Мужамі, татамі не стаўшыя?
Не дачакаліся дадому
Дзяцей сівыя маці вашыя.

А ім са зброяй цяжка
крочыцца -
Саха ў руках ямчэй
трымаецца,
Ім ваяваць зусім не хочацца,
Ім забіваць не падабаецца.

Жыццё раптоўна стала
таннае,
А смерць вось-вось глядзі
абдыме.
Яны ўміралі, бо адданыя
Былі знясіленай Радзіме.

Радзіме, для якой за кратамі,
Пасля ў тайзе капалі рэкі
За тое, што былі салдатамі,
Касцьмі лажыліся пад рэйкі.

І славу горкую
«блакаднікаў»,
Канцлагеры, расстрэлы,
печы,
І званні ворагаў і здраднікаў
Цярпелі стомленыя плечы.

І працавалі, як у бой ішлі,
Хваробы толькі зарабляючы,
Апроч рубцоў ад ранаў
колішніх
Нічога ад жыцця не маючы.

Апроч дзяцей і цяжкай
памяці
Ні на каго не спадзяваліся,
Вось так і дажылі да старасці,
Перацярпелі, пратрымаліся.

Глядзіце - вось яны, апошнія,
Былыя вязні і салдаты,
І медалі іх пераможныя
Звіняць, нібы званы-набаты.

Каб мы не забывалі дзякаваць
За тое, што жывем на свеце,
За прыгажосць Масквы і
Кракава,
За мір і згоду на планеце!

Са святам вас, дзяды і
прадзеды,
З вялікім святам Перамогі!
Хай будзе радасці вам
дадзена,
Але не крыўды і трывогі.

І свет вам да зямлі
паклоніцца,
Зайграюць маршы, і салюты
Зазіхацяць ярчэй за сонца -
Для вас урачыстыя мінуты.

За сцяг над купалам рэйхстага,
За подзвігі і ўзнагароды
Для вас пашана і павага
Ў гэты дзень і назаўсёды!

# НАВІНЫ ФАКУЛЬТЭТА ПСІХАЛОГІІ І ПЕДАГОГІКІ

● У гэтым годзе на аддзяленні педагогікі і методыкі пачатковага навучання плануецца вярнуцца да практыкі асобнага прыёма па спецыяльнасцях: 1) настаўнік пачатковых класаў, настаўнік музыкі і спеваў; 2) настаўнік пачатковых класаў, настаўнік выяўленчага мастацтва; 3) настаўнік пачатковых класаў і сацыяльны педагог. Падрыхтоўка сацыяльных педагогаў будзе весціся ўпершыню ў рэгіёне.

● На аддзяленні псіхалогіі пачынаецца падрыхтоўка псіхолагаў са спецыялізацыяй юрыдычная псіхалогія.

● 20 красавіка ў рамках праграмы знаходжання прафесара Станіслава Забельскага з філіі Варшаўскага універсітэта ў Беластоку адбылася сустрэча з выкладчыкамі, псіхолагамі і сацыяльнымі педагогамі г. Гродна. На сустрэчы прысутнічалі 12 псіхолагаў і сацыяльных педагогаў школ горада.

● Кафедра педагогікі завяршыла апрабацыю новага курса «Педагагічныя тэхналогіі». Дацэнтам В.В. Грынкевічам выдадзены дапаможнік па курсу. Кафедра распрацоўвае навучальны дапаможнік па гэтаму курсу для вну рэспублікі.

● У стадыі завяршэння праца па адкрыццю Гуманітарнай базавай школы пры ГрДУ і факультэце псіхалогіі і педагогікі. Школа будзе працаваць па наступных напрамках: 1) выяўленчае мастацтва; 2) псіхалогія і педагогіка; 3) гісторыя і культура.

● У рэктарат ГрДУ звярнуўся мэр г. Ліды з просьбай аб адкрыцці філіі факультэта псіхалогіі і педагогікі ў Лідскім педагагічным вучылішчы.

# *У ВЫДАВЕЦКІМ АДДЗЕЛЕ*

● У адпаведнасці з пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь N 868 ад 27 снежня 1993 г. «Аб стаўках і парадку выплаты аўтарскага і іншых відаў узнагароджання за выданне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, мастацка-графічныя і фатаграфічныя работы для друку і матэрыялы, перададзеныя на тэлебачанне і радыё» загадам рэктара універсітэта N 139 ад 10.03.1995 г. устаноўлены з 1 сакавіка 1995 г. наступныя памеры аўтарскага ганарару за выдадзеную выдавецкім аддзелам універсітэта літаратуру:

1) пры тыражы выдання да 3000 экзэмпляраў - ад 2% да 5% ад поўнага сабекошту ўсяго тыража выдання;

2) пры тыражы выдання звыш 3001 экзэмпляра - ад 2 да 5 мінімальных заработных плат за 1 аўтарскі аркуш (40000 знакаў).

Нарэшце нашы аўтары змогуць атрымліваць аўтарскі ганарар за свае працы, якія будуць надрукаваны выдавецкім аддзелам. Акрамя гэтага, цяпер пасля забеспячэння патрэбнасцяў бібліятэкі ў навучальных дапаможніках, астатняя частка тыражу будзе прадавацца праз універсітэцкі кніжны кіёск усім жадаючым.

● У сувязі з павелічэннем страт па выданню навучальнай і метадычнай малатыражнай літаратуры і з мэтай упарадкавання размеркавання надрукаваных выдавецкім аддзелам універсітэта выданняў загадам рэктара N 225 ад 11.04.95 упарадкавана сістэма выдачы аўтарам і аўтарскім калектывам, рукапісы навучальных і метадычных выданняў якіх надрукаваны выдавецкім аддзелам універсітэта, *бясплатных* аўтарскіх экзэмпляраў.

# КАНФЕРЭНЦЫЯ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦАЎ

11-14 красавіка на факультэце замежных моваў ГрДУ адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя



«Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе». Правядзенне такіх канферэнцый стала для кафедры рускай і замежнай літаратуры ўжо традыцыяй. Сённяшняя - трэцяя па ліку - была прысвечана праблемам тэарэтычнай і гістарычнай паэтыкі. На канферэнцыі, у працы якой прынялі ўдзел вучоныя Масквы, Пскова, Лодзі, Мінска, Гродна, было заслухана звыш 30 дакладаў.

Канферэнцыя пачалася 11 красавіка пленарным пасяджэннем, на якім з прывітальным словам выступілі прарэктар па навуковай працы ГрДУ С.А.Маскевіч і дэкан факультэта замежных моваў Л.В.Рычкова. Яны расказалі аб перспектывах развіцця універсітэцкай навукі, пажадалі ўдзельнікам канферэнцыі плённай працы. Даклады, прадстаўленыя на пленарным пасяджэнні, былі прысвечаны найбольш актуальным праблемам сучаснага літаратуразнаўства. Доктар філалагічных навук прафесар О.І. Фядотаў (Масква) у дакладзе «Польская силлабика и ее влияние на восточнославянские литературы» вылучыў новую гіпотэзу гетэрагеннага паходжання прозы і паэзіі. Кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Л.Н.Ляўшун (Мінск) прапанавала арыгінальную канцэпцыю абгрунтавання жанравай сістэмы старажытнай усходнеславянскай славеснасці. Малавывучаныя рэцэпцыі еўрапейскага рамантызму ў творчасці польскамоўных паэтаў Беларусі XIX ст. асвятліў загадчык кафедры беларускай літаратуры ГрДУ дацэнт К.І.Лецка. Найбольшую цікавасць і жывую дыскусію выклікаў даклад кандыдата гуманітарных навук В. Парнеўскага (Лодзь, Польшча) « Западноевропейская и русская позитивная утопия ( к вопросу о типологии)».

12-13 красавіка праца працягвалася на пасяджэннях секцый.

**Секцыя 1**. «Жанры и жанровые системы в истории литературы», была самай шматлікай, даклады, прадстаўленыя на ёй, прысвечаныя розным аспектам праблемы жанра, адрозніваліся палемічнасцю і высокім узроўнем навуковага даследавання. Тон пасяджэнню задала дацэнт А.О.Шэлемава (Мінск), якая ў дакладзе «Слово... Повесть... Песнь» прапанавала зноў звярнуцца да пытання аб жанравай структуры «Слова о полку Игореве». Дацэнт Т.Я. Аўтуховіч (Гродна), прааналізаваўшы рускія рыторыкі XVII-XVIII ст.ст. паказала развіццё рускай эстэтычнай свядомасці на прыкладзе катэгорыі вымыс-







# ПАЗНАННЕ ФЕНОМЕНА ВАСІЛЯ БЫКАВА

Вялікі сын беларускага народу і яго духоўны прарок Васіль Быкаў доўгі час жыў і працаваў у Гродне, напісаў тут большую частку твораў. У апошні час у плане вывучэння жыцця і дзейнасці В. Быкава ў нас праводзіцца шмат даследаванняў, якія з'яўляюцца неацанімым укладам у пабудову нацыянальнага універсітэта еўрапейскага тыпу.

Нядаўна я па прапанове дэкана факультэта філалогіі І.В. Жука прачытаў для студэнтаў-беларусаведаў курс лекцый на тэму: « Народная культура ў творчасці Васіля Быкава». У адрозненне ад традыцыйнага падыходу асноўная ўвага наведвальнікаў новага спецкурса не засяроджвалася на ваеннай тэматыцы пісьменніка. Усё ж для Быкава галоўнай мэтай з'яўляецца паказ псіхалогіі людзей, раскрыццё іх характару, пранікненне ў самыя глыбокія таямніцы душы. Зразумела, што ўнутраная чалавечая сутнасць найлепш раскрываецца ў нейкіх экстрэмальных сітуацыях, асабліва ва ўмовах абвостранай ваеннай трагедыі.Прызнае гэта і сам В. Быкаў: «Сталася так, што я прызвычаіўся свае ідэі, часта агульначалавечага, маральнага плана, вырашаць на матэрыяле вайны. Мусіць, гэта таму, што мінулая вайна ўсеабдымная, і там усяму было месца». У сваіх творчых пошуках В.Быкаў падобны да К. Чорнага, які гаварыў: «Чалавек - гэта цэлы свет». Акрамя таго, як пісьменніка-псіхолага яго можна паставіць у адзін рад с Л.Талстым, Ф. Дастаеўскім, Я. Коласам.

Пры ўзважаным падыходзе выяўляюцца народна-культурныя асновы псіхалагічнай творчасці В. Быкава. Ужо ў самых загалоўках яго аповесцяў часта прасочваецца народнае светаадчуванне, народныя вераванні і ўяўленні («Праклятая вышыня», «Пайсці і не вярнуцца», «Знак бяды» і іншыя). На наш погляд, для найбольш поўнага культуралагічнага даследавання творчасці гэтага пісьменніка неабходны грунтоўныя веды па міфалогіі, фальклору, этнаграфіі.

Аповесць В. Быкава «Знак бяды» можна па праву назваць пераемніцай паэмы Я. Коласа «Новая зямля» у сэнсе энцыклапедычнага паказу жыцця беларускага народу, яго гаспадарчай і духоўнай дзейнасці. У названым творы В.Быкава добра выяўлена месца народнай мудрасці ў духоўным скарбе прадстаўніка традыцыйнага памешчыцкага землеўладання і носьбіта дарэвалюцыйнай элітарнай культуры пана Яхімоўскага, створаны пераканаўчыя вобразы «хрысціянаў-язычнікаў» Петрака і Сцепаніды Багацькаў, якія кожны свой крок звяраюць са старажытнымі народна-рэлігійнымі вераваннямі і ўяўленнямі.

На старонках аповесці В. Быкава «Альпійская балада» праз вобразы ўцекачоў з нямецкага палону Івана Цярэшкі і Джуліі Наволлі ўдала праілюстравана кантактнае ўзаемадзеянне беларускай народнай культуры і культуры заходнееўрапейскай цывілізацыі. Перад намі паўстаюць дзве дастойныя адна адной культуры, якія стаяць побач, узаемадзейнічаюць паміж сабой, шукаюць новых вышынь.



П. Панчанка ў артыкуле «Подзвіг Васіля Быкава» пералічвае цэлы рад герояў з аповесцяў пісьменніка і зазначае пра іх наступнае: «Гэта наш народ, гэта глыбокія народныя характары». Пры ўсёй павазе да аўтара названага артыкула нельга пагадзіцца з ім у тым, што такая характарыстыка адпавядае ўсім пералічаным персанажам, у прыватнасці, Іваноўскаму (аповесць «Дажыць да світання») і Сотнікаву (аповесць «Сотнікаў»). У сваіх дзеяннях гэтыя людзі кіруюцца не вопытам народнай мудрасці, а нейкай адарванай ад рэальнага жыцця ідэалагічнай пільнасцю і сумленнасцю. Відавочна, што свядомасць таго ж Сотнікава затуманена не столькі гарачкай хворага чалавека, колькі тагачаснай дзяржаўнай ідэалогіяй. Фактычна, лінія паводзін Сотнікава, яго думкі і памкненні, выхаваны ў ім абстрактны савецкі патрыятызм, яго недарэчны гераізм, які ў выніку адваротнай рэакцыі прывёў да людскіх ахвяр, - усё гэта і з'яўляецца хваробай героя ў кантэксце міфічнай камуністычнай рачаіснасці 30-40-х гг. Глыбокім народным характарам паўстае перад намі не Сотнікаў, а яго антыпод Рыбак, які вылучаецца сваім практычным розумам, багатым жыццёвым вопытам, разважлівасцю, веданнем вясковага побыту, сялянскай псіхалогіі. Па сутнасці, ён адзін вырашае ўсе праблемы, звязаныя з пошукам харчу для партызанскага атраду. На кожным кроку наш самаахвярны Сотнікаў аказвае мядзвежую паслугу свайму напарніку, у выніку чаго заданне было поўнасцю правалена, загінулі ўцягнутыя ў гэтую акцыю бязвінныя мірныя жыхары.

У рамках пераацэнкі творчасці В. Быкава мы бачым, наколькі сумленна ён адлюстраваў наша трагічнае мінулае. За пісьменнікам замацавалі літаратурна-крытычны штамп «праўда вайны», але быкаўскую праўду, якая дарэчы, уключае ў сябе справядлівы аналіз усёй савецкай эпохі, паступова забалталі, нават сказілі. У сваіх аповесцях В.Быкаў заўсёды застаецца шчырым асветнікам беларускага народу. Часам ён быў вымушаны рабіць толькі намёкі на нешта страшнае ў нашай нядаўняй гісторыі. Ва ўмовах пільнай цэнзуры таленавіты літаратар знаходзіў выйсце ў выкарыстанні вобразаў-сімвалаў, пісаў іншасказальна, загадкава, але больш-менш уважліваму чытачу ўсё было зразумела. Як пісьменніка-праўдашукальніка В. Быкава можна параўнаць з А. Салжаніцыным.

У аповесцях В. Быкава «Жураўліны крык», «Альпійская балада», «Пастка» разам з паказам жорсткай праўды пра нямецка-савецкую вайну 1941-1945 гг. зроблены яўны акцэнт на трагічныя вынікі калектывізацыі. У аповесці «Знак бяды», яшчэ за некалькі гадоў да нейкай там палітыкі галоснасці, Быкаў не вытрымаў і пайшоў на адкрытую размову са сваім народам пра яго жахлівае жыццё перыяду калектывізацыі. Мала таго, праўдашукальнік Быкаў капае глыбей і паказвае вытокі ўсіх бедаў і няшчасцяў у першых кроках Савецкай улады.

Гэтак званую перабудову В. Быкаў сустрэў раманам «Кар'ер», у якім значнае месца адведзена аналізу сацыяльнага ўціску сталінскай сістэмай духоўных асоб, прама гаворыцца пра гвалтоўнае вынішчэнне хрысціянскай рэлігіі, пра абсурднае адмаўленне ад здабыткаў класічнай культуры. Аўтар рамана пракладвае своеасаблівы мосцік паміж перадваеннай эпохай і першай паловай 80-х гг. Чарговая бутэлька таннага віна, якую набывае ў мясцовай краме Сямён Сямёнаў, сімвалізуе сабой тую галоўную ўзнагароду, якую ва ўмовах савецкай рэчаіснасці заслужыў адзін з найбольш легендарных байцоў былой вайны, сумленны грамадзянін сваёй краіны.

Такім чынам, тонкі псіхалагізм, паслядоўная праўдзівасць, вобразная сімволіка, глыбокі падтэкст - вось далёка няпоўны пералік якасцяў творчасці В. Быкава. Увогуле, гэта ўнікальная з'ява ва ўсёй сусветнай літаратуры. Таму можна з упэўненасцю сказаць, што з цягам часу ўзнікне такая навука, як БЫКАВАЗНАЎСТВА.

**_М. ПАЖАРЫЦКІ,_**
**_Выкладчык Гродзенскага універсітэта_**

**На здымку: пісьменнікі-аднадумцы Васіль Быкаў і Аляксандр Салжаніцын. 1973 г. ( з архіва).**

## АФІЦЫЙНЫ ЛІСТ

**рэктару Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы прафесару Ківачу Л.М.**

Паважаны Леанід Мікалаевіч!

Мы, студэнты 5 курса факультэта філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы (выпускнікі 1995 г.), з вялікім задавальненнем праслухалі цыкл лекцый Пажарыцкага Міхаіла Багданавіча на тэму: «Народная культура ў творчасці Васіля Быкава». Цікава прайшлі семінарскія заняткі. Выкладанне Пажарыцкага М.Б. адрозніваецца высокім прафесіяналізмам, глыбокім веданнем матэрыялу. Дадзены спецкурс уяўляе сабой цэлы комплекс новых, на наш погляд, вельмі перспектыўных, навуковых падыходаў пры аналізе творчасці В. Быкава.

Мы лічым, што спецкурс «Народная культура ў творчасці Васіля Быкава» павінен стаць традыцыйным у сістэме філалагічнай адукацыі нашага універсітэту.

**_Мурын А., Макуца Т., Варанецкая Т. і яшчэ 59 подпісаў._**





# Другое нараджэнне

Імя Аляксандра Аляксандравіча Багданава (1873-1928) людзі майго і бліжэйшых пакаленняў ведалі, канешне, па працы У.І. Леніна «Материализм и эмпириокритицизм. Критические заметки об одной ре-



акционной философии». У ёй невядомы нам Багданаў, які ўпаў у ідэалізм, прадстаўляўся якойсьці абстракцыяй. Сапраўдных прац, крытыкуемых класікамі марксізма-ленінізма, мы не чыталі, і асвоіўшы на першых курсах адказ на асноўнае пытанне філасофіі: матэрыя пярвічная, разуменне другаснае, поўнасцю давяраліся звычайнаму пагляду.

І толькі цяпер, ведаючы, што крытыка правадыроў значыла для чалавека часцей за ўсё смяротны прысуд, які выконваўся раней ці пазней, робімся дапытлівымі, жадаем разабрацца: так кім жа на самой справе быў Багданаў? У гэтым нам дапамагаюць не толькі кнігі мысліцеля, на шэсць дзесяцігоддзяў асуджаных уладамі на нечытанне, але і новыя працы даследчыкаў яго творчасці Н. Сафонавай, І. Нарскага, С. Яцкевіча і іншых.

* * *

Звяртаючыся да палемікі Леніна з Багданавым, мы раптам выяўляем, што апошні ніколі не сцвярджаў пярвічнасць разумення. Урач, прыродазнавец, матэматык, ён разумеў ідэалізм як прыхільнасць ідэе, думцы, творцай і паклоннікам якой заставаўся ўсё жыццё. Ідэю можна пакласці ў аснову стварэння чагосьці практычнага, матэрыяльнага. Ці не ідэі аказваюць уплыў на развіццё грамадства, ці не ўплываюць на характар гэтага развіцця суб'ектыўныя якасці некаторых асобаў..? Урэшце рэшт, можа не спрацаваць самая матэрыяльная рэч - эканоміка, калі яе падпарадкаваць ложнай канцэпцыі, ідэе. Падкупае ўважлівасць Багданава да мноства падрабязнасцяў, фактаў, якія абгрунтоўвалі яго думку. Ён не хуткі на рэзкія вывады, часам некалькі віціеваты, але заснавацельны ў аргументацыі.

У працы «Вопросы социализма», працягваючы спрэчку з Леніным ужо на стадыі канкрэтнага ажыццяўлення яго тэорыі рэвалюцыі, Багданаў пісаў: «Вера и оптимизм хороши для боя, но не хороши для исследования. Вступить же в бой надо на хорошо исследованной почве, и в этом отношении наш максимализм очень опасен; он может служить идейной основой для авантюр и жестких поражений».

Жыццё вельмі хутка пацвердзіла правату Багданава. Сацыяльны эксперымент праводзіўся груба, пры падтрымцы вялікай машыны падаўлення. Калектывізацыя ў шэрагу месц абярнулася жудасным голадам, крывёю «заспакойвалі» потым і розных «ворагаў народу» на меры бясконцага «абвастрэння класавай барацьбы». Сам жа Багданаў, які папярэджваў аб магчымасці «жорсткіх паражэнняў», якіх толькі не быў удастоены «званняў» - «отзовист», «ликвидатор», «ревизионист», «оппортунист». Сёння, хоць і з вялікім спазненнем, працы Багданава і яго пачэснае імя вяртаюцца ў той шэраг імёнаў, якія маглі б скласці славу навукі любой краіны. Гэтая слава мае дачыненне і да Гродзеншчыны, таму што Аляксандр Багданаў - наш зямляк.

Разам з Леніным Багданаў стаяў ля вытокаў бальшавізму. Ён быў сярод арганізатараў некалькіх, пачынаючы з 3-га, з'ездаў партыі. У 1907 годзе ён увайшоў у састаў цэнтральнага органа бальшавікоў «Пролетарий». На гэтым этапе і пачаліся яго разыходжанні з Леніным. У 1909 годзе Багданаў стварае сумесна з А.М.Горкім і А.В.Луначарскім (апошні ў валагодскай ссылцы ажаніўся з сястрою Багданава) на Капры ў Італіі «высшую социал-демократическую школу для подготовки рабочих-пропагандистов». Былі ў яго жыцці арышты і ссылкі. Вымушаная эміграцыя і вяртанне на радзіму, удзел у якасці ўрача ў першай сусветнай вайне... Ведаючы аб гэтым, не перастаеш здзіўляцца яго актыўнай публіцыстычнай, навуковай і літаратурнай дзейнасці. Сваю першую працу «Краткий курс экономической науки» (Москва, 1897) Багданаў выдаў, калі яму было ўсяго дваццаць чатыры гады. У трыццаць з невялікім ён быў аўтарам трохтомнага філасофскага сачынення «Эмпириомонизм» (Москва, 1904-1906) і шэрага іншых вялікіх прац. У кола яго зносін уваходзілі Г. Плеханаў, М. Бярдзяеў, С. Булгакаў, І.Скварцоў-Сцяпанаў, У.Базараў і іншыя мысліцелі.

Філасофскія погляды Багданава знайшлі адлюстраванне і ў яго мастацкай творчасці. У канцы 1907 года ў Петраградзе ён выдаў свой фантастычны раман «Красная звезда», а ў 1913 годзе ў Маскве як працяг першага выйшаў раман «Инженер Мэнни». Можна спрачацца адносна мастацкіх вартасцяў гэтых твораў, але многае выказанае ім носіць прадказальны характар. У іх ёсць праабраз атамнага рухавіка, сістэмы, якая перадае на адлегласць адлюстраванне, ёсць новыя формы арганізацыі быцця і інш. Напярэдадні першай сусветнай вайны ўбачыла свет галоўная праца яго жыцця «Тектология» у трох томах. У ім аўтар праявіў сябе як чалавек самых разнастайных ведаў - эканаміст, сацыёлаг, біёлаг, матэматык, урач, філосаф. Такая кніга магла быць створана асобай рэнесанснага тыпу і планетарнага мыслення. Аўтар не паставіў перад сабою мэту стварыць навуку, якая сінтэзуе матэрыялы ўсіх галінаў чалавечых ведаў. Ён ішоў у нагу з сусветным развіццём думкі: менавіта ў пачатку стагоддзя з'явіліся спробы ўніверсалізацыі законаў, якія ўстаноўлены ў розных навуковых сістэмах.

У сітуацыі крызісу і разбурэння тэарытычныя пабудовы Багданава былі абвешчаны мудрагельствам і названы «возвратом к идеализму», але яго самога пакуль не чапалі: чытаў лекцыі ў МДУ, працаваў у акадэміі, а ў 1922 годзе па заданню Леніна прадстаўляў інтарэсы краіны на Версальскіх перагаворах.

Пасля смерці правадыра поле дзейнасці Багданава звужваецца, але ён зноў распачынае «уласную справу», паклаўшы пачатак новай галіны медыцыны - гематалогіі, службы пераліванння крыві. У 1926 годзе ён стаў дырэктарам першага ў свеце Інстытута гематалогіі. Разумеючы, што сацыяльны пераварот у краіне і ўсё за ім ідучае - гэта гіганцкі стрэс для людзей, вучоны задаецца пытаннем: як звесці яго ўплыў да мінімума? Ён піша працу «Борьба за жизнеспособность», у якой ёсць такое меркаванне: у найбліжэйшых да чалавека жывёл нармальны тэрмін жыцця ў 5-6 разоў перавышае перыяд росту. Калі перыяд гэты дасягаецца чалавекам да 22-25 гадоў, то па аналогіі з жывёламі наша жыццё магло б працягвацца 120-140 гадоў. І Багданаў шукае для дасягнення гэтага метады самыя радыкальныя, у ліку якіх і пераліванне крыві.

Дырэктар інстытута стварае спецыяльную лабараторыю, у якой праводзіць у гэтай галіне сур'ёзныя эксперыменты. У якасці падыспытнага спрабуе перш за ўсё сябе. Эксперыменты здаюцца абнадзейлівымі - ён спрабуе іх у розных мадыфікацыях, і толькі на сабе - 11 разоў. 12 заканчваецца трагічна. А.А. Багданаў загінуў. Ужо разумеючы, што памірае, ён адмовіўся ад урачэбнай дапамогі і да апошняй хвіліны вёў навуковыя назіранні за ўласным паміраннем. Чалавек і мысліцель, ён заўсёды ішоў па жыцці своеасаблівым шляхам, гэтае права засталося за ім і ў смерці.

* * *

Багданаў як асоба ўзнёслая паспяхова мысліў і тварыў. Не абыходзілася і без памылак. Але, напэўна, ёсць асаблівы сэнс у тым, што ўспамінаем яго менавіта зараз, у цяжкі для гісторыі час: вяртанне ідэй Багданава можа паслужыць людзям.

**В. ЧАРАПІЦА,**
**прафесар**

## ВІНШУЕМ З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ!

***КІЧОВУ** Раісу Архіпаўну,*
дзяжурную галоўнага корпуса.

***МАНКЕВІЧ** Клаўдзію Пятроўну,*
вартаўніка.

***ПАЗНЯК** Фаіну Іосіфаўну,*
намесніка галоўнага бухгалтара універсітэта.

***ПРАЦЭНКА** Вольгу Элізараўну,*
дацэнта кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў.

***ЯСНУЮ** Людмілу Фёдараўну,*
лабаранта кафедры ўсеагульнай гісторыі.

***ГАРБУЗАВА** Віктара Мікалаевіча,*
прарэктара па навучальнай працы.

***КРУШАЛЬНІЦКАГА** Аляксандра Аляксеевіча,*
старшага выкладчыка кафедры матэматычнага аналіза.

***КУДРАЎКІНА** Яўгена Васілевіча,*
старшага выкладчыка кафедры дастасоўнай оптыкі.

## INTERNATIONAL SOROS SCIENCE EDUCATION PROGRAM (ISSEP)

## Аспіранты - Сорасаўскія стыпендыяты

***Па выніках конкурсу Міжнароднай Сорасаўскай Праграмы адукацыі ў галіне дакладных навук грант «Сорасаўскі аспірант» будуць атрымліваць наступныя нашы аспіранты:***

1. **РЫНКЕВІЧ Ірына Міхайлаўна** (навуковы кіраўнік Васкабоеў А.І., доктар біялагічных навук, прафесар, заг. кафедры біяхіміі і біятэхналогіі).
2. **СЦЯПУРА Віталь Іванавіч** (навуковы кіраўнік Маскевіч С.А., кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, прарэктар па навуковай працы).
3. **ЮРКЕВІЧ Аксана Уладзіміраўна** (навуковы кіраўнік Васкабоеў А.І., доктар біялагічных навук, прафесар, заг. кафедры біяхіміі і біятэхналогіі).
4. **АЎЧЫННІКАЎ Яўген Віталевіч** (навуковы кіраўнік Струк В.А., доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык кафедры матэрыялазнаўства і рэсурсазберагальных тэхналогій).

## ПАМЯЦІ СЯБРА



Памёр Андрэй Пяткевіч.

Памёр 29 красавіка, у вёсцы Уселюб, крыху не дажыўшы да 29-ці гадоў. Мы ўсе даўно ведалі, што сэрца яго невылечна хворае, што адбыцца тое можа кожны момант, але гэтая простая фраза ўсё роўна здаецца нейкім злым цудам. Слова «цуд» пэўна было ўлюбёным у лексіконе Андрэя. Зь яго ён пачынаў свае лісты, цудамі Андрэй жывіўся, цудам зьяўляўся на сьвет кожны яго верш. Пра вершы Андрэй казаў: «Мне Дух дыктуе, таму я ня маю права іх правіць». І ніколі ня правіў. Цяжка было знайсьці чалавека больш энэргічнага, няўрымсьлівага і парадаксальнага, чым Андрэй Пяткевіч. Сілы свае ён шчодра траціў і на дробязі і на вялікае, бо для яго ня было ў сьвеце дробязяў. Вялікае ж было тое, што ён першы і адкрыта, яшчэ ў колішнія часы, стаў змагацца за Беларушчыну. Андрэй быў адзін, але не баяўся ні пасьміханьняў, ні ўладных пагрозаў.

Ён называў сябе «філёзафам жыцьця», апошнім кінікам. І праўдзы, яшчэ ад школьнае лавы быў ня проста самотным дысыдэнтам, а сучасным кінікам, беларускім Дыягенам, у якім спалучалася сялянская практычнасьць, дзіцячая прастата і кніжны суб'ектывізм. Андрэй меў рэдкі дар найзвычайнейшыя словы перарабляць у паэзію. Аднойчы ў яго напісалася:

*Мая бочка калгас,*
*А я сам Дыяген.*
*Не прыйду я да вас*
*Не схілю я калень.*

Гэтак ён пакінуў, не разьвітаўшыся, і родную alma mater, гэтак ён пакінуў усё, здавалася, Андрэю прыносіць задавальненьне «сячы пад сабою сук», пэўна, у ім жыло неадольнае трагічнае памкненьне. Нездарма, ці не галоўным матывам яго вершаў была незваротная дарога. Цяпер запраўды незваротная.

Мы, сябры Андрэя, пакідаем гэтае апошняе, і далёка ня поўнае слова пра яго і просім надрукаваць «тарашкевіцаю», якую паэт шчыра абараняў і адмаўляўся друкаваць вершы на іншай граматыцы.

Вечная табе памяць, Андрэй, прабач нас.

*Юрась Пацюпа,*
*Галіна Плаўская,*
*Анжаліна Дабравольская,*
*Едрусь Мазько,*
*Анатоль Брусевіч,*
*Юры Гумянюк,*
*Сяргей Богуш,*
*Янка Трацяк.*

## ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ!

Кафедра алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі сумесна з кафедрай педагогікі абвяшчаюць конкурс на тэму: «Урок, які я хацеў бы правесці». Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца студэнты 3 курса матэматычнага факультэта. На разгледжанне конкурснай камісіі прымаюцца падрабязныя сцэнарыі (планы-канспекты) аднаго або некалькіх узаемазвязаных урокаў. Лепшыя распрацоўкі будуць разгледжаны на студэнцкім навукова-метадычным семінары пры кафедры АГ і МВМ.

Асноўныя патрабаванні да ўрока: урок па зместу павінен адпавядаць школьнай праграме, змяшчаць элементы навізны і быць нестандартным па форме.

Тэрмін падачы сцэнарыяў (распрацовак) да 1 кастрычніка 1995 г.

Сцэнарыі прымаюцца на кафедры алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі.

**Конкурсная камісія.**


**Рэдактар Н.КРАСНІЦКАЯ.**
**Камп'ютарная вёрстка А.СЯМЁНАЎ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не паздзяляючы пункту гледжання аўтара. Матэрыялы друкуюцца на мове арыгінала.



Наш адрас:
230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404. Тэл. 44-72-97



Газета выходзіць адзін раз у месяц. Аб'ём - 1 друк. арк.
Здана ў на[illegible] .05.95 г.
Заказ 2196
Наклад 1000 асобнікаў.

Газета набрана і звёрстана на камп'ютарнай тэхніцы выдавецкага аддзела універсітэта, аддрукавана ў Гродзенскай абласной узбуйнёнай друкарні, Гродна, вул. Паліграфістаў, 2.
Рэгістрацыйнае пасведчанне 421.

Заснавальнікі: Вучоная Рада універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.